**Асаблівасці дыпламатычнага цэрыманіалу Вялікага княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай**

**Лазоркіна В.І.**, *ФМА БДУ*

Прытрымліванне звычаяў дыпламатычнага пратаколу заўсёды з'яўлялася неад'емным атрыбутам знешнепалітычнай практыкі. Спецыфіка геапалітычнага становішча і ўнутранага складу Рэчы Паспалітай абумовіла разнастайнасць форм дыпламатычнага цэрыманіялу.

Аб прыбыцці амбасадара каралеўскі двор быў дасведчаны загадзя праз ганцоў. Звычайна амбасадары ставілі ў вядомасць аб сваім прыбыцці міністраў і некаторых сенатараў, якія складалі праграму іх наведванняў. Цэрымоніяй сустрэчы кіраваў маршалак (каронны або літоўскі, у залежнасці ад таго, дзе ў дадзены час знаходзіўся кароль).

З вялікай пышнасцю адбываліся сустрэчы пасольстваў з Маскоўскай Русі. Так, маскоўскае пасальства, якое прыбыла з мэтай ратыфікацыі Палянаўскага міру ў 1634 г., сустракалі вышэйшыя службовыя асобы РП, менавіта сандамірскі падкаморны Асалінскі і троцкі харунжы Агінскі. Пасольскі картэж дасягнуў лічбы 300 вершнікаў. У прадмесці Варшавы маскоўскім паслам была выдзелена сталая сядзіба. Праз некалькі дзен адбылася аўдыенцыя ў караля. Пры ўваходзе ў замак, з двух бакоў растаўляліся пехацінцы з мэтай узняць годнасць каралеўскага атачэння.

Звычайна маскоўскіх амбасадараў прымаў сам кароль. Прыём праходзіў ва ўрачыстых абставінах. Акрамя манарха, у зале прыёму прысутнічалі сенатары і прадстаўнікі шляхты РП. Уваходзячы ў залу, амбасадары павінны былі здымаць высокія шапкі, але маглі пакідаць на галовах цюбетэйкі. Падыходзячы да трону, амбасадары па чарзе прадстаўляліся каралю, адважвалі яму паклон і, зняўшы цюбэтейку, цалавалі яму руку. Літоўскі канцлер зачытваў лісты маскоўскай дэлегацыі. Пасля завяршэння цэрымоніі прадстаўлення, амбасадарам дазвалялася сесці на загадзя падрыхтаваную лаву і абвясціць пункты наказу маскоўскага цара.

З адказным словам да амбасадараў ад імя манарха Рэчы Паспалітай звяртаўся канцлер Вялікага княства Літоўскага. У сваёй заяве ён пералічваў асоб, упаўнаважанных праводзіць перамовы і называў месца іх правядзення. За літоўскім канцлерам выступаў канцлер каронны, які падцвярджаў яго словы.

Замежныя дыпламаты не мелі ў Варшаве сталых памяшканняў (толькі Прусія мела так званы «Брандэнбургскі палац»). Памяшканні ім выдзяляў канцлер або маршалак. Дыпламаты вышэйшага рангу карысталіся гасціннасцю магнатаў, спыняючыся ў іх асабістых уладаннях.

Улады Рэчы Паспалітай надавалі сур'ёзную ўвагу пытанням падтрымання прэстыжу дзяржавы на міжнароднай арэне. У кантактах з

замежнымі дзяржавамі на першы план выходзілі такія фактары, як прадстаўнічасць і ўрачыстасць. Асабліва гэта тычылася адносін з Маскоўскай дзяржавай. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што пасольствы часта бывалі такімі шматлікімі, што хутчэй нагадвалі паход невялікага войска, чым дыпламатычную місію. Да Масквы і ў Турцыю адпраўляліся пасольствы толькі самага высокага рангу. Ў гэтых дзяржавах прыбыцце простага пасла лічылася як наўмыснае зняважанне. Напрыклад, у склад пасольства Льва Сапегі ў 1600 г., акрамя знатных асоб, уваходзілі 400 чалавек прыслугі і простых людзей 700 чалавек. Але ў 1635 г. пры падпісанні Палянаўскай дамовы, бакі ўмовіліся наконт пасольскіх праважатых. Амбасадары павінны прыязджаць са 100 праважатымі, пасланцы з 30, ганцы з 6 і не знаходзіцца на тэрыторыі замежнай дзяржавы больш за два месяцы.

Як бачым, дыпламатычны цэрыманіал Рэчы Паспалітай вызначаўся гібкасцю і дэмакратычнасцю. Замежныя пасольствы прымаліся ў адпаведнасці з традыцыямі, усталяваўшыміся паміж дзяржавамі. У адносінах з краінамі Заходняй Еўропы прытрымліваліся цэрыманіялу французскага ўзору, які ўсталяваўся ў перыяд праўлення Людовіка XIV.

## Политика и законодательство Германии в отношении поздних переселенцев (краткий обзор)

**Леонова Е. Ю.**, *ФМО БГУ*

В силу исторических обстоятельств германская нация оказалась раздробленной. Поэтому проблема возвращения этнических немцев на родину является насущной для правительства Германии уже более 50 лет.

В XVIII–XIX веках причинами миграции были: политическое угнетение иностранными и собственными правителями, подати своим князьям и чужим властям, хозяйственная нужда, неурожаи, голодные годы, Семилетняя война, наполеоновские войны, иностранная оккупация. Переселение происходило преимущественно на территорию России. Затем причинами переселения явились Первая и Вторая мировые войны. В августе 1941 года по приказу Сталина все немцы, проживающие к тому времени в Центральной России и на Украине, были насильно переселены в Казахстан и в Сибирь. После войны все немцы находились под жестким контролем. Через 4 года после смерти Сталина в 1957 году немцы были официально реабилитированы и им было разрешено покидать места поселения. Но многие так и остались в Казахстане или в Сибири, потому что возвращаться всё равно было некуда. С наступлением периода гласности стало возможным переселение в Германию.